Куды ня уцякай—нідзе ня збараніцца. Ня збароніць і Вільня. Гэта ясна мяртвецкай Радзя, але што ж зробіць, калі штосці падбухторвая і распаляя пачуцьцё:

Ой, як хочацца жыць!

Хоць у пакуця сударгі, хоць абманваючы сяое—але... жыць!..

Змітро Жылуновіч.

Маленькі фэльятон.

I.

Новы партфэль.

Каля печы на услонку
Абнудзелы сеў Варонка
І схінуўшыся да долу
Крапуў думак нявясёлых.
«Гэта ж жарты, ціж ня праўды?
Ужо прышоў каюк ля Рады
І правід ля ей багаты
Ляпнуў у гразь з сакратар'ятам!
У хмарынах, у тумане
Мая слава абавяня
І вятрыска толькі шухня,
Як імя мае заглухня.
Аб мне памяць зацямнея
На закідпуй пустой кнеі.
Не, ня буду жыць я болей,
Ня зміруся с сваей доляй...
Згібла праца задарэмня—
Знаць спыніціся цяпер мне
Толькі й можна у магіля»...]
І Варонка з дзікай сілай
Устаў з услону і памчаўся
Да сталу, дзе нож валяўся.
Адзін момант, адна хвіля
І ахвяра есць магіля—
Нож ужо уверся закруціўся...
У гэты момант хтось з'явіўся
Іскракідным дзіўлым зданьням,
Ды рукою ценькай пані
Дакрануўся яго цела.
Няпрытомны, агалцелы
Стаў Варонка і... заплакаў.
«Ня журыся, сцешся, браця»
Праказаў таемны голас—
«Ля цябе Бог няадпакаў,
Ня адпака й яго маці—
Дык ня скрыўдзяць й ні на волас.
Згібла праца табе у Радзя—
Да другоная Бог наладзя,
Й ня да горшай, ведай, хіба...
Йдзі, мой мучальнік, у Тарыбу—
У суседняго народу
«Усенародную» управу.
Працай там ты сабе славу
Нажывеш і верняш шкоду;
С тваім пэнтам вёрткім, быстрым
Займеш мейста ты міністрам
Беларускай роднай справы»...
І загінуў бляск яскравы,
І замоўк таемны голас.
Сеў Варонка няпрытомным,
Захаваўшысь у змроку цёмнум...

Усе сціхла. Змрок гусціўся.
Дух Тарыбы вокал віўся,
А у куточках між сцянамі
Зорыў выгляд цяляграммы,
Што Варонка—гэты шэльма
Слаў с хаўруз'яй да Вільгэльма.

Авадзіон.

II.

Посмяхі жыцця.

Час ішоў. Вечарамі застаючыся дома «бяз працы языком» экс-старшыня народнаго сэкрэтарыяту Беларусі, пан Варонка чуў сябе дрэнна. Прывыкшы заўсягды красавацца на людзях у чыне старшыні дзе кожная кінутая хоць зьнячэўку слова—золата, бо «будуя беларускую дзержаўнасць», прывыкшы кіраваць дзержаўнымі справамі сваей бацькаўшчыны у ва усіх 22 камісіях Рады Б. Н. Р., прывыкшы чуць сябе як-ні-як гэтым самым кіраўнічым усіх і нікога, «першы» грамадзянін зямлі Беларускае чуў сябе дрэнна...

Пан Серада кіраваў бяз яго і можна сказаць бяз сябе, бо увесь час працоўнаго дню цікавіўся больш вэтэрынарнымі справамі правых эсэраў у губэрскум земсцвя, дзе за гэта усе ж плацілі і пыталіся працы. Раду ня склікалі, п. Скірмунт саўсім ісчэз з гарызонту п. Варонкі і цэлымі днямі, а ня то што вечарамі ня было чаго рабіць і усе няздавольства палітычнаю доляю падкатвала к горлу і хацелася плакаць ня то аб страця Беларусяю такога цэннаго дзержаўнаго працаўніка, ня то ад дрэннаго самапачуцця, якея, гаворац заўсюды бывая у бапапарстыстаў, калі воляю гістарычнаго лесу іх атсылаюць атпачываць ад працы... Скольки раз п. Варонка прабаваў узяць сябе у рукі і заняцца іншымі справамі: та збіраўся выдаваць журнал «Варта», та пісаў свае мэмуары (успамны), та падтрымоўваў знаемства з лейтанантамі і фон Факельнгейма ля карысці сваей любай бацькаўшчыны... Але... далея аклада журналу агалашэння—абвесткі у газэтах яго супрацоўнікаў, ад большасці каторых ня было атрымана ніякаго саглась і асяцанкі пісаць, далей заявы аб выданні пану нямецкаму цэнзару, каторы ніяк ня зацікавіўся тым, што у «Варця» будуць артыкулы і на нямецкуй мовя—справа з журналам далей ня пайшла... Патрэбны былі на гэта грошы, а... у касе Б. Н. Р. скрабліся шчуры, п. Скірмунт толькі маўчаў аб гэтум, лейтананты ж Факельнгейма умелі толькі самі выкарыстаць пана экс-старшыню сакратарыяту, робячы яму прыемнасць плаціць за сяое... А потым успаміналася першая проба карміцца літэратураю, і пан Варонка падканец кідаў папку с паперамі журналу на самая дно свайго чамайдану... Брр!.. Ізноў галадаць і халадаць. Дзякуй за ласку!..

Мэмуары п. Варонкі так сама ня пайшлі далека... Цераз дзень-другі нейкая млоснасць агарнула сэрца пана Язэпа і ен хутка адкінуў пяро у бок...

— Што я па—праўдзя?!..

Я ж яшчэ ня збіраюся паміраць, што уздумаў пісаць успаміны.. Хваліць цябе Божа, мне толькі.. толькі мінула 30 гадкоў (здаецца так я назваў лік сваіх гадоў пання Алексюччанца)... Што я, паправудзя, здурэў ці што?.. Скуль гэта... Госпадзі, ня у ліхі б гэта задумана было час...

І прышлося устаць, каб пацерці віскі пахучаю вадою Кельну... Але сумныя думкі увесь гэты дзень ня пакідалі п. Варонкі, а ноччу прысьніўся страшны сон...

Быццым ляжаў ен на ложку і дрэмаў і ось... Адчыніліся дьв ры і кабета у нацыянальнуй вопрацы, закрыўшы твар ладонямі, схіліўшы галаву і горка плачучы вайшла і стала у нагах ложка... Ох, гэты плач, горкі, горкі плач скрыўджанае кабеты... Камянь лег на сэрца снавідцы, п. Варонка сіліўся устаць, але ня мог... І у гэты ж момэнт тонкі свіст касы над галавою і чырвоны цвет змусіў яго павярнуць галаву назад.. Другая кабета уся у чырвонум, худая як шкілет, з касою у руках, глядзела на яго заядла і с помстаю... З жудасным страхам ускрыкнуў грамадзянін Варонка і прачнуўся...

— Госпадзі, Божа наш... Што гэта са мною... Я мусі хворы... Я ж ня вінян перад табою, матачка Беларусь!.. Гэта ж бальшавікі, а потым немцы... А гэтая халера чырвоная... хто гэта мог быць?... Чырвоны свет, худая.., Мусі Равалюцыя... а чаму ж с касою... Ага гэта Сацыяльная Равалюцыя галодных, аттаго худая як палка, а с касою, бо патрабуя ахвяр бяз конца...

І доўга ня мог пасля гэтаго супакоіцца пан Варонка...

Цэлымі днямі слапяўся экс-старшыня з вугла у вугал сваиго пакою, або флянаваў па вуліцы, сквэрыку і каля кавярні Вэнгрэнецкаго, але час цягся марудна і іржа грызла душу усе глыбей і глыбей...

Нават новая сэсія Рады ня навесяліла. Сядзець ня па сакратарыятскум фотэлі, а лаўках дэпутацкіх, гэта было так няцікава пасля петраградскаго Перадпарлямэнту... Выбіралі дэлягацыі ізноў... у Бэрлін к Вільгельму, у Варшаву к панам Рады рэгэнцыяльным, у Вільню (смяхота! Гэтаго дзіка, Мамоньку, туды уперлі) к літвіном і яшчэ нікуды, але што усе гэта...

. . . .

Так ішоў марудна калісьці час дзеля п. Варонкі...

Але у адзін прыемны (што я? Выбачайця! Няпрыемны) дзень ударыў гром. Ня глядзячы на зіму і ясная неба Беларусі... Пантафлевая жыдоўская пошта прынясла вестку, ой-ой якую, быццам бальшавікі збіраюцца займаць Беларусь... А потым усе гэта і папраўдзя пачалося...

Дзень-другі п. Варонка хадзіў сам ня свой, пахмуры, разбіты і камбінаваў... Як ня цягло у Варшаву—ня паехаў... А адным днём шчэз з Мінску...

Бальшавіцкі агэнт тэлеграфаваў у Маскву:

«Белорусскіе министры бежали в Вильну».

Цяраз 4—5 дзен п. Варонка так сама знячэўку з'явіўся да дому, як і шчэз. На ем было уздзета добрая новая палито, пад пахаю навнесяньскі партфэль з нейкімі іншымі, ніж былі калісці на старом партфэлі старшыні знакам!

Стала:

Л.-Б. Н. Р.

Аркады Смоліч стаяў перад саусім іншым п. Варонкаю—брытым, надушаным, малайцаватым... У пятліцы сурдуту замеcта бела-чырвона-белае стужачкі красаваліся іншыя коляры...

п. Аркады дзівіўся, тыркаў п. Варонку у грудзі, смяяўся з яго новаго выгляду і пытаўся усе.

— Ну гавары ж аткуль вярнуўся... Кажы, што за партфэль? Ну гавары ж, Язэп... Што за коляры у цябе новыя...

Варонка, спешна складваючы свае манаткі у куфэрак, трымаўся патаемнасці перад старым сябрам...

— Гэ, братка, ня усе так адразу раскусіў... Трэ дзеля гэтаго радзіцца з галавою, здольнаю да дзяржаўных спраў...

Куды табе, брат, быць сакратаром асветы, калі ты бяз сміякалкі...

А потым, памучыўшы трохі п. Аркадыя, узяў яго за гузік, адвеў у бок і сказаў:

— Даволі жартаў!... Ось што... Наш усе эвакуюцца у Вільню... Няхай сабе Антось Луцкевіч клапоціцца з кабінэтам Народных міністраў Беларусі... Мы, мінчукі, даволі з гэтым наклапаціліся... Я зрабіўінакай... Бачыўся я с. п. Вальдэмарам, старшынею ураду Літвы, падаў яму праект аб далучэньні мае бацькаўшчыны, Гродзеншчыны, да Літвы с тою умоваю, каб літоўцы узялі за міністра па беларускім справам... Луцкевіч потым дагаворыцца наконта адносін усей Беларусі, а сваім крокам я пасадзіў у лужу літвіноў, во няперака ня яны, а мы беларусы, самі будам вясці свае беларускія справы... Ось што, Аркасю, ці ня хочаш быць павятовым старастаю у Слоніма? А мо бліжэй да мяне? у Бельску?... Як знаеш... Выбяры любоя места у Гродзяншчыня—дам там табе старасту... Пан Вальдеаар даў мне гэтая права...

П. Аркады задумаўся...

Калі усе было ужо гатова і звязана у дарогу, п. Варонка раптам нешта успомніў... Худка падышоў ен к сталу, атчыніў шуфляду, выцяг вялікую кучу папераў з афіцыяльными тітламі на верхнюм лівум рагу («Рада Беларускай Народнай Распублікі») і мінут некулька думаў, потым адчыніў дзверы, паззваў Ганку:

— Гапачка, гэта усе можаш спаліць—больш мне няпатрэбна...

Прыяцялі пацалаваліся моцна, Аркады выбраў Ліду (бо бліжэй да заграніцы) і рамізнік першы раз на санках у гэту новую зіму павез новаго міністра на Віленскі вакзал...

Па дарозя п. Варонка затрымаў свайго фурмана каля газэччыка, узяў № „Мінская газэты" і сказаў газэччыку:

— Будзяш помніць, браток, што 4 снежня у цябе купіў газэту «міністар па бяларускім справам Літвы і Беларусі Язэп Варонка»...

І пакінуўшы дурнога мінскаго дамакрата с рашчыняным ротам, хутка паехаў на чугунку...

Стары-Малады.

Аб усім па троху.

З Беларусі.

На паляпшэньня сельскаго гаспадарства.

Себежскім (Віт. губ) іспалкомам паведляна усім валасным радам (саветам), каб яны бярджэй здалі усе грошы, якія дасталі за праданы хлеб з нацыяналізаваных маёнткаў. Гэтымі грашыма хочуць расплаціцца за расходы па падліку ураджаю 1918 г., а лішку даць у распараджэньня Себежскаго зямельнаго аддзелу дзеля узняцьця і паляпшэньня сельскаго гаспадарства у павеця. (Зап. Ком.).

Вандроўныя селянска - гаспадарскія курсы.

Сонскі (Віт. губ., Себеж. пав.) атдзел люцкое асьветы пастанавіў адчыніць у воласці вандроўныя селянска-гаспадарскія курсы.

У ачышчанум ад немцаў г. Дрысе.

У гор. перабраўся Вайскова-Равалюцыйны Штаб Ушчата закладаньня савецкай уласці. Валасныя старшыны схаваліся. Украдзяны люцкія грошы і дабро. Белагвардзейцы і іх спагадачы уцяклі у Освеи і Кахановічы. Паштовыя прылады украдзяны, дроты парваны. У гарадох і мястэчках нядастача яды. Збройная сіла маяцца, але чуяцца нядастача работнікаў. (Зап. К.).

Дом у імя К. Маркса.

Аршанскі іспалком адпусціў 3995 руб. грошы ля налажэньня дому Працы у імя Карла Маркса. (Зап. К.).

Стрэча чырвонага войску.

У вёсцы Шарповічы (Маг. губ., Сен. пав.) адбыўся сход, на якім была прынята разалюцыя аб бягучым моманту, у яком выказваяцца пачуцьцё радасці пры сустрэчы першых абаронцаў Савецкае (радавае) Расеі і просьбу перадаць Радзя Народных Камісараў, што селяня-беднякі вёскі Шарповічы, сыштоўшыся ля выбару першаго камітэту беднаты, радасна вітаюць едзіны ахоў уласці селян і батракоў—Раду Р. К. і Селянскіх Дапутатаў. (Зап. К.).

Паўтара мільёна на адбудову Савецкай (радавай) уласці у Вітабшчыня.

З Масквы павядамілі Вітабскі Губіспалком праз Аблікамзап, што яму пераведзяна паўтара мільёна рублёў на расходы дзеля адбудовы і умацаваньня Радавае уласьці глаўным чынам у ачышчаных ад немцаў мейстох. (Віт. Із.).

Хаўруснікі памагаюць Беларускуй Радзя.

Хаўруснікі абяцаюць літоўскуй «Тарыбя» даць падмогу грашмі дзеля гуртаваньня літоўска - беларускаго войску і прыслаць сваиго войску. (Изв. Сов.).

Незалежнасць Літвы.

Літоўская «Тарыба» цешыцца, што хаўруснікі прызналі незалежнасць Літвы, з выхадам да мора праз Усходнюю Пруссю і з граніцою на поўдні пауз Нёман. (Изв. Сов.)

Раўнапраўя мову у Ліцьве.

На засяданні Літоўскае Тарыбы 29 наябра г. г. абгаворваўся праэкт міністра справядлівасьці аб дачэсных судох. У пункця 10-м праэкту гаворыцца так:

---

3) Парабкаўскія суполкі разам с тым пачалі збіраць рожныя фонды на культ.-асьветныя і інш. мэты (так, напрыклад, у 1913 г. 63 парабкаўскія суполкі таkіх фондаў мелі 124,600 рублёў), і

4) Дастатак парабкаўскіх суполкі, іх супольная праца настолькі адукавала парабкоў у грамадзянскум сэнся, што раней воражна глядзеўшыя на сельска-гаспадарскія суполкі работніцкія сындыкаты (хаўрусы) Ферраро і Балоньі цяпер перамянілі свой на іх погляд.

Вось якую вялікую перамену робяць сел.-гаспадарскія суполкі на весцы.

Звярочваючыся цяперака да Беларусі, мы павінны сказаць, што у нас на бацькаўшчыня незвычайна-удатныя умовы ля будовы сел.-гаспадарскіх камунаў.

Зямельная цясната на Беларусі вельмі вялікая, бо беларускія губэрні лічацца за пуста паселяныя. У адносінах ліку вясковаго люду да адпае дзесяціны зямлі выходзіць што:

Мінская	губ.	палічвая	97	чал. на 1 дз.
Магілеўск	„	„	100	„ „ „ „
Вітабская	„	„	84	„ „ „ „
Смаленская	„	„	80	„ „ „ „
Гродненская	„	„	81	„ „ „ „
Віленская	„	„	86	„ „ „ „

І ня дзіва, што беларуская селянства сціснута нядастачаю зямлі. Вось с таблічкі відаць гэта выразней; лік у ей зроблян на 1 студня 1914 гаду:

	надз. земля:	прыватна-уласнае:
Віленская губ. мае:	1279 тыс. дз.	1533 т. дз.
Гродненская „ „	1517 „ „	2135 „
Мінская „ „	1946 „ „	5257 „
Магілеўская „ „	1619 „ „	2314 „
Смоленск. „ „	1936 „ „	2634 „
Усяго надз. з.	9.890 „ „	
прыватна-уласнае		15.076 „

Па шасці губэрнях Беларусі прыватна—уласнае зямлі больш чым на 5 мільёнаў дзесяцін! Лік ня малы!..

Панская гаспадарка вядзецца па маёнтках вельмі добра, асабліва у вялікшых маёнтках, вядзецца наймацнейшая выкарыстання зямлі і маяцца цэлая армія парабкаў, якія увыклі к супольнаму гаспадаренню і будуць найлепшымі будаўнікамі сельска-гаспадарчых камунаў. Найвялікшыя (магнацкія) маёнткі часова варта выкарыстаць, павеўшы у іх дзержаўную гаспадарку; сярэднія, дзе гэта адразу ж удасца, варта выкарыстаць дзеля камунаў с тых самых парабкаў, якія раней да гэтаго у маёнтках працавалі. Можна спадзявацца, што гэта будуць найлепшыя гнязда камунізму у вёсках і за імі пачнуць будавацца тысячы новых. Трэба толькі адразу ж усе камуны згуртаваць у хаўрус, каб падтрымваць і павялічваць той звязак, які яднае іх шмат у чым і дзеля таго каб карыстаць практыкаю другіх і ня рабіць тых жа самых абмылак.

Умовы жыцця нашаго селяніна, за рэдкім выняткам, цяжкія і мы можам надзеяцца, што само жыцце паможа скорэй будовя па Беларусі камунаў.— На беларусах жа камуністах ляжыць абавязак узяць на свае плечы гэтую працу.

Наз. Бысаеўскі.

„Судзі павінны умець гаварыць і на іншых мейсцовых мовах (польская, беларуская), калі учаснікі працэсу ня ведаюць дзяржаунае мовы; тым, хто ня ведая тут памяніоных мовау,—дае ца тулмач. М. Біржышка прапануя посьля слова „беларуская“ дадаць „і жыдоуская“. Міністр справядлівасьці растулумачвая, што закон ня забараня ніводнае мовы, не памяніонай у закона, але што беларуская і польская мова названы тут толькі дзеля таго, што больш другіх папшраны у Ліцьве.

Папраука адкінута.

М. Біржышка просіць прадстаунікау друку адмеціць гэта у друку.

(ЛИТ. КУР.).

Падмога Тарыбы беларускаму т-ву „Золак“.

Літоуская Тарыба вызначыла 5000 р. беларускаму таварыству „Золак“ на дабрачынныя і культурна-прасьветныя задання.

Як павядамляя „Lit. Ajd.“ т-во „Золак“ зьвярнулася да Тарыбы з прозьбаю аб перадачы яму казіоннага будынку (былое гімназіі) пад беларускую школу.

(ЛИТ. КУР.).

Арганізавання меськаго самапрауленйя у Вільні.

Згодна з умовою прадстаунікау літоускаго, беларускаго, польскаго і жыдоускаго насялення Вільні загадвання меськаю гаспадаркаю пярайходзіць ад немцау да мяшанае камісіі, у склад якой павінны увайсьці 3 жыды, 3 палякі, 1 беларус і 1 літовяц. Камісія будзя гаспадарыць толькі часова да агульных меськіх выборау (ня пазьнеі 15 января) на шырокіх дэмакратычных падставах.

(ЛИТ. КУР.).

„Общество руских граждан Белорусско-Литовского Края“.

У Вільні утварылася „Общество руских граждан Белорусско-Літовского края“. Заданьямі гэтаго таварыства іосьць 1. Абарона грамадзянскіх прау беларуска-рускаго насялення ад магчымых на яго нападау. 2. Падтрымання і захавання рускай культуры у краі. (ЛІТ. КУР.) Што гэта за „беларуска-рускае насялення“, якое шануючы т-ва звайшло у нашым краі? Ці не ёсьця тут рауно [illegible] расеіскія [illegible]?

Фармавання беларускаго войска у Вільні.

У Віляпскуй газэця „Виленскія Повости“ № 2 за 3-е дзекабра г. г. абвешчана, што усе ваенныя, якія пажадаюць запісацца да беларускаго войска, могуць зрабіць гэта штодзенна на Ягорьускум 11 ад 10 да 1 і ад 4 да 6 вечарам, апрача надзель.

Літоускі Унівэрсытэт у Вільні.

З января месяца падыходзячаго году у Вільні пачне функцыянаваць Літоускі Унівэрсытэт. Навучання будзя весьцся па-літоуску, па-польску і па-расейску. Пытання аб устанауленні катэдры на старажыдоускуй мовя застаулена адчыненым.

Пры Унівэрсытэця будуць такія атдзелы (факультэты): тэолёгічны, соцыолёгічны (абымаючы сабою юрыдычны і гістарычна-філёлёгічны), мэдычны і матэматычны.

Пры мэдычным факультэця будзя адчынены вэтэрынарны аддзел.

(ВИЛ. КУР.)

Падгатоука да ачышчэння Гродні.

Перагаворы між асобнымі нацыянальнасьцямі для прынягця упраулення места ад намецкай улады ідуць далей. Магчымы компроміс між жаданнямі нацыянальнасьцяу. Угода будзя пададзяна на зацьвярджэння намецкаму генэральнаму камісару. Посьля гэтаго будзя перададзяна улада.

(ГОМАН).

У Віляпскум павеця.

Польскія паны арганізаваліся; яны маюць шмат агітатарау, якія ходзяць па вёсках, раздаюць польскія праклямацыі, [illegible] да легіёнау і інш. Аднак польскім агітатарам ня вельмі удаецца. Вельмі часта іх праганяюць з вёскі.

Даходзяць вясёлыя весткі аб беларускум руху. Беларуская арганізацыя [illegible] упярод. Сам народ прыняу я за арганізавання.

(ГОМАН).

У Ваукавыскум павеця.

29 новбря ч. г. у Вільню да Беларускай Рады прыехау дэлегат з Ваукавыскаго павету [illegible] Квецінскі. Дэлегат павядаміу, што у Ваукавыскум павеця усё насялення жадаюча незалежнаго Літоуска-Беларускаго Гасударства. Толькі вельмі нівялічкі процэнт насялення, загітаванага панамі і ксяндзамі-полёнізатарамі, хацела-б быць прылучанай да Польшчы. Аднак з прычыны таго, што народ вельмі хутка пазнае свае патрэбы, іосьць надзея, што скора толькі адны паны будуць хацець прылучыцца да Польшчы. У павеця шмат сьвядомых беларускіх працаунікоу.

(ГОМАН).

Дакляpацыя прадстаунікау Беларускае Рады. (Віленскае).

Прадстаунікі Беларускай Рады 27 лістапада (наябра) пры уступленні у Раду Літоускаго Гасударства (Тарыбу), зрабілі гэткую дэклярацыю:

«Беларуская Рада, выбраная на Канфэрэнцыі 25—27 студня (января) 1918 г. прадстаунікамі беларускаго насялення на заход ад лініі старога фронту, апіраючыся на пастановах названай Канфэрэнцыі і маючы ідэалам утварэння фэдэратыунаго Літоуска—Беларускаго Гасударства, дзеля важнасьці перажываемаго моманту, знайшла патрэбным прыступіць да конкрэтнай работы з Літоускаю Тарыбаю, як ядзіным цяпер істнуючым літоускім прадстауніцтвам.

Беларуская Рада верыць, што два народы злучаныя гістарычна і эканамічна, падаушы адзін аднаму руку, патрапяць здабыць сабе вольнае і нязалежная жыццё, ідучы дарогай дэмакратычнага будауніцтва агульнае дзяржавы.

(ГОМАН)

«Пагромы у Вільні».

З Гаагі прыходзяць весткі, што у Вільні рускія (беларусы?) і жыды зрабіл пагром палякау. Тутэйшыя людзі найлепей знаюць усю дурнаусто гэтай выдумкі, каторая пушчана у сьвет, каб давесьці, што авечкі ядуць ваукоу.

(ГОМАН).

Аб уступленні беларусау у Тарыбу.

«Цайтунг дэр 10 Армэ» вітая уступлення беларусау у Тарыбу і спадзяецца, што гэта будзя пача кам концэнтрацыі усіх краіовых сіл усіх нацыянальнасьцяу у Тарыбя, як гэта заусягды думала нямецкая улада.

(ГОМАН).

Нямецкія салдаты хочуць вярнуцца на Беларусь.

На апошнім заседанні Віленскае Савецкае Рады было даведзяно, што шмат нямецкіх салдатау, якія вярнуліся ужо у Нямеччыну, хочуць вярнуцца у наш край с прычыны благіх варункау жыцця і працы у Нямеччыня.

(ГОМАН).

Эвакуацыя з Вільні нямецкаго банку.

Адзін з двух нямецкіх банкау у Вільні «Остпрэусішэ Ляндшафт» ужо ліквідавау сяае справы і пераехау у Прусы у Інстэрбург.

(ГОМАН).

Сколькі у Мінску буржуяу?

Мінская Меськая Рада на сваіом засяданні 5 дзекабра г. г. пастанавіла абложыць жыхароу Мінска адначасным падаходным налогам. Было падлічано, сколькі іосьць у Мінску багатых людзеі (буржуяу). Як павядамляя «Минская Газета» іх аказалася: маючых гадавога даходу ад 25.000 р. да 50.000 р—130 асоб; ад 50.000 да 150.000—150 асоб; ад 150.000 да 500.000—20 асоб; ад 500.000 да 1.000.000—10 асоб; маючых больш. 1.000.000 р. даходу—6 асоб.

Колькі можна трымаць у Мінску запасау?

На засяданні 5 дзекабра г. г. Мінская Меськая Рада пастанавіла, што жыхары могуць трымаць у сябе дома харчы не вышэй такой нормы:

Жыта—5 пуд., пшаніцы (альбо пшанічнае мукі)—2 пуды (!), круп—1 пуд (!), масла 10 фунт., сялядцоу або іншай рыбы—10 ф., цукру—1 пуд. (!!!), гарбаты—1 ф., мыла—20 ф., карбіту—10 ф., сьвечак—3 ф., табакі—2 ф., аусу—3 пуды, сена—50 пуд., саломы—50 пуд., вотрубей і алжынкау—10 пуд. (Минск. Газ.) Калі Меськая Рада звальняя ад рэквізіцыі гэткія запасы, дык можна быць пэуным, што у Мінску яшчэ ня ведаюць голаду. Тымчасам Меськая Харчавая Управа зьвярталася і да Украйны і нават да амэрыканскаго пасла у Копэнгагэня аб прысылкі харчоу дзеля «катастрафічнаго харчавога палажэння у месьця». Вось хіба зараз дазнаюцца па праудзя, што такоя голад!

Селяне ачышчаюць край ад памешчыкау.

У Мінскуй губ. селяне паляць памешчыцкія сядзібы, рабуюць ураджай, развалакаюць скаціну. Выканаучы Камітэт Органау Меськаго і Земскаго Самаураду, сацыялістычных партый і прафэсыянальных арганізацыяу зьвярнууся с клічам да усяго беларускаго селянства змагацца з грабежствам, падпаламі і расцягваннем народнаго дабра.

Мінская паветавая земская сабрання так сама выпусьціла адозву, у якой пасьвядчая, што ужо былі выпадкі крывавых стычак, рабункау, забойств. Адозва заклікая да вытрамання і спакойства, бо інача можа выйсьці вялікая шкода і так ужо зруйнованай народнай гаспадарцы; усіо гэта затрымая развязання зямельнаго пытання законадаучаю дарогаю «Беларусь перажывая цяжкія часы», гаворыцца у адозвя, «і яе бліжайшая будучына зусім нявыразная. Толькі само насялення дружнымі усіліямі зможа захаваць народную гаспадарку ад раштовае гібелі». Дзеля усяго гэтаго адозва заклікая да фармавання пры валасных земскіх управах часовых дружын самаабароны.

(Дело Труда).

Політэхнікум Заходняе Каммуны.

У Горках Магіл. губ іосьць тры спэцыальныя школы: зямлямерна—агранамічная, сельска-гаспадарская і сельска-гаспадарска-рамеясніцкая. Першыя дзьве адпавядаюць школам сярэдняй ступені, а трэцяя як бы раунялася вышэйшуй пачатковуй. Іосьць праэкт усе гэтыя школы злучыць у адну і адчыніць політэхнікум. Дзеля гэтаго з кожнаго ад гэтых школау пабывала у «Обліскомзапя пікум з адпаведнымі атдзеламі. Дэлягацыя і паехала у Маскву.

Да адчынення у Горках вышэйшае сельска-гаспадарскае школы іосьць надта добрыя варункі. Да 1863 г. тут быу Краіовы сельска-Гаспадарскі Інстытут, які быу посьля пераведзяны да Петраграду і перафармованы у цяперашні Лясны Інстытут. Ад інстытутскіх часау у Горках засталіся будынкі, паркі, садзівальнік, садовы пітомнік, оранжэрэі, сажаука, мэтэоролёгічная станцыя, малочныя фармы, склад—музэй сельска-гаспадарскіх машынау, завод цэглы і завод для выраб сельска-гаспадарскіх машынау, кніжніца, лябараторыі, розныя навуковыя габінэты і інш.

(Зап. Ком.)

Плата за рэквізаваныя тавары.

У заплату за [illegible] тавары Савецкая [illegible] у Мінску уплатила [illegible] Мінскаго земства [illegible] 460.000 марак [illegible] 85.000 марак.

Выплата зроблена праз [illegible] А. О. К. І. [illegible]

Усяго пры астауленні Мінска немцы пакідаюць у казначэйстве 1.500.000 марок.

(Минск. Газ.)

Прызнанньня Савецкае уласці.

У Мінску бунд і мяньшавікі прызналі Савецкую уласць.

На нон гэтаго т. т. Ракоускі і Радак зрабілі параду усіх напрамкау сацыялістау. С парады выяснілася, што можна паладзіць агульную працу.

(Изв. Сов.).

У Нясьвіжы.

З г. Нясьвіжу (Мінс. губ.) уцякла траха уся местовая буржуазея з бурмістрам Грабоускім, баючыся прыходу чырвонае арміі, якая ужо падыходзіць к Нясьвіжу.

(Изв. Ц. К.)

Далучэньня Беларусі.

Па Мінску развешана праклямацыя на расейскуй, польскую і жыдоускуй (а беларуская дзе?) мовах, падпісаная мінскім Саветам, у якой гаворыцца, што Беларусь далучана да Рас. Рад. Фэдэр. рэспублікі.

(Изв. Ц. К.).

Пад Гомэль падыходзіць Пятлюрауская войска, якоя разганяя Саветы і праводзіць палітыку нябошчыцы рады, падзеушай на Украйну нямецкая ярмо.

(Изв. Ц. И. К.).

Кансерваторыя у Вітабску.

(Карэспандэнцыя).

Памаленьку і у нашай бацькаушчыння, праз цемныя заслоны, пачынае ясная соняйка прабівацца і да гаротнаго беларускаго народу. Посьля усей тэй аграмады друкаванаго слова, якоя даходзячы да нашаго селяніна, адчыняя новы сьвет перад яго вачамі, пробуюць яго думкі і загадывая яго лепшаго жыцця,—народу [illegible] магчымасьць пазнаць [illegible] настонкасьць музыкі [illegible] вялікіх музыканскіх талентау.

Посьля атрывання у Мінску Кансерваторыі, якая цяпер перароблена у чыста беларускую і у нас у Вітабску з г таго году адчыняяцца Народная Кансерваторыя, дзе будуць вучыць, як музыца на усіх штрум итах гэтак сама і сьпеву. Ахвотнікау вучыцца у Кансерваторыі зьявілася натта шмат; падаз на да 2.000 заяу, але б дыніна, дзе прытулілася Кансерваторыя, ніпазв ляя усіх прыняць, што занатта шкода.

У нядзелю 8-га дзекабра, у будынку гарецкога тэатру адбылося адчынення Віцебскай Народнай Кансерваторыі, дзе быу дадзяны першы па сваей вартасьці музыканскі канцэрт, пры учасьці прафэсарау Кансэрваторыі. Канцэрт прыманіу да сябе поуны тэатр народу, які вышау с тэатру натхнены усладай ад загаравонай настонкасьцю музыкі. Німа што і гаварыць, што кансерваторыя натта патрэбна у Вітабску. Трэба толькі паказаць каб вучнеу знаемілі з беларускай музыкай і сьпевамі і каб музыка кансерваторыі нядаграпічылася гарацкімі мурамі, а каб яна далека разнасілася і па нашых весачках ды зьлівалася з нашым беларускімі матывамі і давала усладу гаротнаму працауніку селяніну.

М. М—о.

З за граніцы.

Скарапацкі уціок.

Скарапацкі адрокся. Разам з грамадкай сваіх прыхільнікау і часткаю армі, з някаторымі міністрамі уціок няведама куды. Уся уласць на Украіня у руках Петлюраускаго войску, якоя увайшло у Кіяу, пяючы нацыянальныя песьні. Вуліцы убраны нацыянальнымі сцягамі. Народ, уздыхнуушы свабодняй, вітау войска Петлюры. Толькі буржуазея і хуліганы патужыліся спрачацца і стралялі, але іх уцешылі. У Кіявя парадак. Усе рады, што збавіліся ад Скарапацкаго.

(Изв. Ц. И. К.).

Нясаглас поміж хаурусьнікамі.

З газэты „Баз. Нахрыхтэн“ (праз Звінск) павядамляюць, што пошля парады між англічанамі,—французамі і італьянцамі выяснілася, што поміж Пранцыі, Італі і Англі з аднаго боку і Амерыкі з другога—німа болйй бышаго сагласу. Рашэньня парады трымаіцца у тайну.

Глум над немцамі хаурусьнікау.

Хаурусьнікі, акопныя Германію, [illegible] немцамі здекуюцца з яе.

Гэтак, акупацыйная французская ваеннае улада у Вісбадану зрабіла паназуру.

Далей, французы занялі мост праз рэчку Рэйн, зрабілі барыкады з мешкау с пяском, прыставілі куляміоты і пусцілі музыньскі праход. Гэтым праходам, яны прапускаюць нямецкіх селян і адбіраюць у іх усе тоя, што яны вязуць на рынак у г. Манггейм прадаваць. (Изв. Ц. И. К.).

Гэн. Манэргэйм—галава Фінляндыі.

Фінлянскі соім назначыу галавою гасударства гэн. Манэргэйма, які прыбаве распрaвіуся пры помачы немцау з фінлянскаю равалюцыяю. (Изв. Ц. И. К.).

У Аустрыі дрэнна.

На засяданьню Нацыянальнаго збору міністры Бауэр і Рэннар абрысавалі цяжкая палажэньня Аустрыі.

Аканамічная (з за яды, абмену тавара у і гандаль) вайна паміж асобнымі нацыянальнымі гасударствамі былой Аустрыяцкай дзяржавы памагая раструсі. Чэхі і славяне пралазяць у нямецкія вобласьці, забіраюць іх, стараючыся да агульнае мірнае канфярэнцыі прыйці з хвантам у руках—што нямецкія вобласьці імі акупаваны.

(Изв. Ц. И. К.).

Вялікая Польшч.

Пан Грабскі, сябар польскаго правіцяльства, павядаміу прадстаунікау друку, што Антанта (хаурусьнікі) лічыць патрэбным залажыць моцная польская гасударства. Польшч павінна будзя схаурусавацца с тымі гасударствамі, якія заложаны між Балтыцкім і Чорным морам. У гэтым хаурус увойдуць Румыньня і Юга-Славія. Польшч будзя мяжаваць з Румыньняй.

(Изв. Ц. И. К.).

У Лісабоні, на вакзаля, забіт прэзыдэнт Партугальскае рэспублікі Сідоніо.

(Изв. Ц. И. К.).

Паміж Грэцыяй і Пранцыяй зроблен хаурус абаронны і наступовы на 25 год. Грэцыя дае слова вартаваць французкія інтарэсы на Усходзя, узамен грашавое, тэхнічнае і ваеннае помачы з боку Пранцыі. Пранцыя абяцая так сама збудавць дзеля Грэці у пяць гадоу пяць бранямосцау-драднотау, двапанцаць крэйсарау, сорак міпаносцау і [illegible] падводных лодак.

(Изв. Ц. И. К.).

Редактор и Издатель:

Редакционная Коллегия.

3-я Государственная Типография Р. С. Ф. С. Р., Тверская, Мамоновский пер., д. 12.